Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!
Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА
І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

71 (7397)
СЕРАДА
18
красавіка 1945 г.

Цана 20 кап.

Войскі 2-га Украінскага фронта, прадаўжаючы наступленне, 17 красавіка авалодалі цэнтрам нафтаноснага раёна Аўстрыі— горадам Цыстэрсдорф.

Слава гераічнай Чырвонай Арміі!

ЗАГАД

Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

Камандуючаму войскамі 2-га Украінскага фронта
Маршалу Совецкага Саюза МАЛІНОЎСКАМУ
Начальніку штаба фронта
генерал-палкоўніку ЗАХАРАВУ

Войскі 2-га УКРАІНСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, сёння, 17 красавіка, авалодалі цэнтрам нафтаноснага раёна Аўстрыі—горадам ЦЫСТЭРСДОРФ.

У баях за авалоданне горадам ЦЫСТЭРСДОРФ вызначыліся войскі генерал-палкоўніка ШУМІЛАВА, генерал-маёра ЛУКІНА, генерал-маёра КРУЗЕ, генерал-маёра СТАШЭНКА, генерал-маёра ГРЫГАРОВІЧА, палкоўніка ОРЛОВА, генерал-маёра МІРНОВА, генерал-маёра ЛОСЕВА, генерал-маёра ГРЭЧАНАГА, генерал-маёра ГАРБАЧОВА, палкоўніка МАРОЛЬ, палкоўніка ПАНАВА, палкоўніка ЕРОМІНА, палкоўніка ВЕЛЫЧОВА; артылерысты генерал-лейтэнанта артылерыі ДЗЕРЭША, генерал-лейтэнанта артылерыі ПЕТРОВА, палкоўніка МІРОНАВА, палкоўніка БАГУШЭВІЧА, палкоўніка ПАЎЛІКА, падпалкоўніка ЕЎЛІНА, падпалкоўніка ПАПЛЫКА, падпалкоўніка ПАЛЗУХІНА; танкісты палкоўніка МЕЛЬНІКА, палкоўніка БРЫЖЫНЁВА, палкоўніка ЗЕТРЫАНУ; лётчыкі генерал-палкоўніка авіяцыі ГАРУНОВА, генерал-лейтэнанта авіяцыі СЕЛЕЗНЁВА, генерал-маёра авіяцыі КАМАНІНА, генерал-лейтэнанта авіяцыі СЦЕПІЧАВА, генерал-лейтэнанта авіяцыі ПАДГОРНАГА; сапёры палкоўніка ПЕНЮКА, падпалкоўніка ЕЗЕРСКАГА; сувязісты палкоўніка БАРЫСЕЙКА, палкоўніка ДАВЫДАВА, палкоўніка дзяржаўнай бяспекі КАРПАВА.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за авалоданне горадам ЦЫСТЭРСДОРФ, прадставіць да ўзнагароджання баявымі сцягамі.

Сёння, 17 красавіка, у 21 гадзіну сталіца нашай Радзімы МАСКВА ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 2-га Украінскага фронта, якія авалодалі горадам ЦЫСТЭРСДОРФ,—дванаццаццю артылерыйскімі залпамі з ста дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні АБ'ЯЎЛЯЮ ПАДЗЯКУ кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за вызваленне ЦЫСТЭРСДОРФА.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захопнікам!

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН.

17 красавіка 1945 года.
№ 338.

ЗА НОВЫЯ ПОСПЕХІ Ў СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ СПАБОРНІЦТВЕ!

Совецкі народ рыхтуецца да сустрэчы свята Першага мая ва ўмовах гістарычных перамог Чырвонай Арміі. З кожным днём усё бліжэй час канчатковага краху фашысцкай Германіі. Слаўная Чырвоная армія штурмуе фашысцкае логава на подступах да Берліна, хуткімі тэмпамі ідуць да Берліна і англа-амерыканскія войскі. Выдатныя поспехі на франтах Айчыннай вайны натхняюць працаўнікоў совецкага тылу на новыя подвігі ў імя Радзімы, у імя хутчэйшага разгрому ворага. Кожны совецкі чалавек імкнецца зараз прыдбаць з падвоенай, патроенай энергіяй, аддаць усе свае сілы на справу забеспечання фронта ўзбраеннем, боепрыпасамі, харчаваннем. У гэтыя дні з новай сілай разгортваецца соцыялістычнае спаборніцтва на прадпрыемствах, транспарце, у сельскай гаспадарцы.

З усіх куткоў нашай рэспублікі прыходзяць весткі аб тым вялікім уздыме, які пануе зараз сярод працоўных гарадоў і вёсак. Вызвалены беларускі народ, верны роднай Чырвонай Арміі і вялікаму Сталіну, імкнецца як мага хутчэй залячыць раны, нанесеныя гітлераўцамі народнай гаспадарцы краіны. Працоўныя горадоў з вялікім энтузіязмам аднаўляюць фабрыкі і заводы, жыллёвыя дамы, культурна-бытавыя ўстановы. Калгаснікі і працаўныя аднаасобнікі зараз напружана працуюць на палях, змагаючыся за высокі ўраджай гэтага года.

Энтузіязм працоўных з кожным днём расце. Набліжаецца дзень вялікага свята працоўных Першага мая. Совецкі народ імкнецца сустрэць яго новымі выдатнымі дасягненнямі ва ўсіх галінах роднай гаспадаркі. Шырыцца соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу Першага мая. Гэтае соцспаборніцтва падняло і падымае новыя тысячы людзей на высокапрадукцыйную працу. У соцспаборніцтве вырастаюць новыя трохсотнікі і пяцісотнікі, новыя наватары соцыялістычнай вытворчасці.

Самаадданая працуе калектыў завода, дырэктарам тав. Арутунян. Тут кожны цэх, кожная брыгада і асобна рабочыя спаборнічаюць паміж сабой і дабіваюцца новых і новых поспехаў. Комсамольска-маладзёжная брыгада тав. Пракурат систематычна выконвала свае дзённыя нормы па 300—450 процантаў. 16 красавіка ў соцспаборніцтве з ёю ўступіла брыгада тав. Коршуна. У выніку ў гэты дзень абедзве брыгады далі самую высокую выпрацоўку на заводзе—па 500 процантаў нормы. Увесь калектыў прадпрыемства, заключыўшы соцыялістычны дагавор з калектывам аўтарэмзавода, рашыў на месцы пераможцам у соцспаборніцтве.

На прадпрыемствах Мінска, Барысава, Лепеля, Магілева, Гомеля, Пінска, Баранавіч і іншых гарадоў узяты новыя навыдатныя абавязацельствы. Паспахова выконваўшы план першага квартала, калектыў барысаўскага запалкавага камбіната імені Кірава змагаецца ў соцспаборніцтве за новыя выдатныя паказальнікі. Усе брыгады камбіната ў чэсць свята сталі на стаханаўскую вахту. Зараз многія з іх выконваюць норму на 300—350 процантаў. Калектыў пінскага суднабудаўнічага завода, уключыўшыся ў соцспаборніцтва, даў слова выканаць вытворчую праграму красавіка на 105 процантаў, закончыць аднаўленне трох нафтаналіўных барж і здаць у эксплаатацыю свой лесапільны завод, які будзе садзейнічаць хутчэйшаму рамонту старых і будаўніцтву новых суднаў. Свае абавязацельствы суднабудаўнікі з поспехам выконваюць.

Вялікімі справамі жыве зараз вёска—рэспубліка ўступае ў масавую веснавую сяўбу. Гэта найбольш адказны перыяд сельскагаспадарчага года. Закладваецца аснова будучага ўраджаю. У барацьбе за высокі ўраджай разгарнулі паміж сабой соцспаборніцтва вобласці, раёны, калгасы, МТС, вёскі, брыгады, звенні.

Прыкладам высокага энтузіязма ў працы могуць служыць калгасы і МТС Хойніцкага раёна. Тут усе сельгасарцелі і МТС змагаюцца за пяршынства ў рэспубліцы. У выніку многія калгасы завяршылі ўжо сяўбу ранніх каласавых. Узоры сасамаадданай працы паказваюць трактарысты Хойніцкай МТС. Нядаўна Старшыня Саўнаркома БССР і сакратар ЦК КП(б) Беларусі тав. Панамарэнка ў сваёй тэлеграме віншаваў трактарыстаў Хойніцкай МТС Елену Чэркас і Сяргея Назарэнка з іх першымі поспехамі. Гэтыя трактарысты-стаханаўцы, уключыўшыся ва ўсесаюзнае соцыялістычнае спаборніцтва работнікаў МТС, у першыя дні палявых работ, выконваючы штодзённа па дзве нормы, узаралі на сваім трактары 72 гектары і зэканомілі 75 кілограмаў гаручага.

Прайшло некалькі дзён, а Елена Чэркас і Сяргей Назарэнка дабіліся ўжо новых поспехаў. Учора мы атрымалі з Палесся тэлеграму аб тым, што Елена Чэркас з сваім напарнікам Сяргеем Назарэнка ўжо выпрацавалі на трактары да 120 гектараў, пры гэтым зэканомлена больш 90 кілограмаў гаручага. Якасць работы добрая. Елена Чэркас, рыхтуючы дастойную сустрэчу Першаму мая, забяспечыла бесперабойную работу свайго трактара на працягу 20 гадзін у суткі.

Задача партыйных і совецкіх арганізацый, кіраўнікоў фабрык, заводаў, калгасаў і МТС—узначаліць вытворчы ўздым мас, не супакайвацца на дасягнутым. Трэба памятаць, што ёсць яшчэ ў нас нямала адстаючых прадпрыемстваў, калгасаў. Па-сапраўднаму узначаліць соцыялістычнае спаборніцтва—значыць падцягнуць адстаючых да ўзроўню перадавых.

Пытанні хуткага і высокаякаснага правядзення веснавой сяўбы, выканання планаў прамысловымі прадпрыемствамі, шырокага разгортвання будаўнічага сезона—усё гэта рашаючыя моманты ўсенароднай барацьбы за аднаўленне разбуранай ворагам народнай гаспадаркі. Вакол гэтых пытанняў і разгортваецца зараз соцыялістычнае спаборніцтва. Трэба дапамагчы рабочым, калгаснікам, працоўным аднаасобнікам выканаць узятыя на сябе абавязацельствы. Трэба замацаваць першыя поспехі, каб ніспыння рухацца ўперад.

Вышэй сцяг соцыялістычнага спаборніцтва! Сустрэнем вялікае свята працоўных новымі вытворчымі поспехамі.

Ад Совецкага Інформбюро

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 17 КРАСАВІКА

На працягу 17 красавіка на ЗЕМЛАНДСКІМ поўвостраве на захад ад Кенігсберга, войскі 3-га БЕЛАРУСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, з баямі занялі горад і порт ФІШХАУЗЕН і населеныя пункты ЛІТАУСДОРФ, ГАФКЕН, ЗАНГЛІНЕН, КОЙЕНДОРФ, ДАРГЕН, ТЕНКІТЭН, КАЛЬКШТАЙН, ЛЕГІНЕН, РОЗЕНТАЛЬ, КАРЛЬСХОФ, ВІШРОДТ, БЛЮДАУ, НЕПЛЕКЕН, ЦЫМЕРБУДЭ, ПАЙЗЕ. Рэшткі разгромленай групы нямецкіх войск адкінуты у раён порта ПІЛАУ, дзе і знішчаюцца нашымі войскамі. У баях за 16 красавіка войскі фронта ўзялі ў палон 5.650 нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі наступныя трафеі: самалётаў — 47, танкаў і самаходных гармат — 47, бронетранспарцёраў — 78, палявых гармат — 385, мінамётаў — 210, кулямётаў — 730, аўтамашын — 2.512, трактараў і цягачоў — 64, чыгуначных вагонаў—350, складаў з ваеннай маёмасцю — 36.

Войскі 2-га УКРАІНСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, 17 красавіка авалодалі цэнтрам нафтаноснага раёна Аўстрыі — горадам ЦЫСТЭРСДОРФ, а таксама занялі больш 30 другіх населеных пунктаў і сярод іх ПАЛЬТЭРНДОРФ, МУСТРЭНК, КЕТЛАСБРУН, ПААСДОРФ, ХЕБЕРСБРУН, ВОЛЬФПАСІНГ, ХАУТЦЭНДОРФ і чыгуначныя станцыі ДАБЕРМАНСДОРФ, ГЕСТЫНГ, ПААСДОРФ. На тэрыторыі Чэхаславакіі, на паўночным захадзе ад горада ГАДОНІН, войскі фронта занялі населеныя пункты КРУМВІР, ШЧЫТБОРЫЦЭ, КРЖЭПІЦЭ, ГУСТОПЕЧЭ, СТАРОВІЦЭ, ПОПІЦЭ, ВРАНОВІЦЭ.

Войскі 3-га УКРАІНСКАГА фронта на тэрыторыі Аўстрыі, на поўначы і захадзе ад горада САНКТ-ПЕЛЬТЭН з баямі занялі населеныя пункты ОБЕР-ВЕЛЬБЛІНГ, АМБАХ, ХАУЗГЕЙМ, ОБРЫЦБЕРГ, ВАЙТЦЭНДОРФ, ГЕРЕСДОРФ, ХАФІНГ.

На астатніх участках фронта — баі мясцовага значэння і пошукі разведчыкаў.

За 16 красавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 86 нямецкіх танкаў і самаходных гармат. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 50 самалётаў праціўніка.

* * *

На Земландскім поўвостраве, на захадзе ад горада Кенігсберга, нашы войскі прадаўжалі наступленне. Жорсткія баі адбыліся за горад Фішхаузен—важны апорны пункт абароны немцаў, які прыкрывае подступы да порта Пілау. Совецкія танкі і пяхота з поўначы прарвалі ўмацаванні знадворнага абарончага абводу Фішхаузена. Абарончы абвод праходзіў у двух-пяці кілометрах ад горада і складаўся з некалькіх ліній траншэй, вялікай колькасці дотаў і дзотаў, прыкрытых дротавымі загародамі і міннымі палямі. Магутнымі ўдарамі нашай авіяцыі і артылерыйскім агнём варожая абарона была дэзарганізавана. Поччу совецкія танкавыя і пяхотныя падраздзяленні ўварваліся на вуліцы Фішхаузена. Імклівымі ўдарамі нашы войскі зламалі супраціўленне шматлікага гарнізона праціўніка і поўнасцю авалодалі горадам Фішхаузен, размешчаным у 13 кілометрах ад порта Пілау. Такім чынам, у руках немцаў асталася толькі паўднёва-заходняя аканечнасць Земландскага поўвострава. Тэрыторыя, якая займаецца праціўнікам, абстрэльваецца совецкай артылерыяй. На мысе на паўднёвым усходзе ад горада Фішхаузена нашы часці прадаўжалі весці баі па ліквідацыі акружанай групы нямецкіх войск. Совецкія танкісты і пехацінцы занялі апорныя пункты Цымербудэ, Неплекен, Пайзе і расчлянілі варожую групу на дзве ізаляваныя адна ад другой часткі. Праціўнік нясе велізарныя страты. Месцы баёў завалены тысячамі трупаў гітлераўцаў. Колькасць палонных увесь час павялічваецца.

У Кенігсбергу нашы байцы выявілі ў падвале аднаго дома і ўзялі ў палон генерал-маёра войск СС Фрыца Зігеля.

У баях па ліквідацыі рэштак усходнепрускай груціроўкі праціўніка совецкія байцы і афіцэры праяўляюць адвагу і высокае воінскае майстэрства. Танкавы экіпаж лейтэнанта Дзевіна знішчыў цяжкі нямецкі танк, уварваўся ў населены пункт і разграміў некалькі агнявых кропак праціўніка. Кулямётчыкі Каваленка і Ліманскі ў адным баі знішчылі 27 гітлераўцаў. Адбіваючы варожую контратаку, старшы сяржант Давыдаў агнём з пратітанкавай гарматы падбіў два нямецкія танкі.

* * *

Войскі 2-га Украінскага фронта авалодалі цэнтрам нафтаноснага раёна Аўстрыі горадам Цыстэрсдорф. Імкнучыся ўтрымаць у сваіх руках гэты раён, немцы сканцэнтравалі буйныя сілы танкаў і пяхоты і аказвалі ўпорнае супраціўленне. На асобных участках баі пераходзілі ў рукапашныя схваткі. Цеснячы праціўніка, нашы войскі паступова абцякалі горад з трох бакоў. Затым совецкія часці прадпрынялі імклівую атаку і авалодалі горадам Цыстэрсдорф. У баі за горад знішчана звыш двух тысяч салдат і афіцэраў праціўніка. Спалена і падбіта 15 нямецкіх танкаў і самаходных гармат.

Нашы лётчыкі ў паветраных баях збілі 14 варожых самалётаў. Агнём зенітнай артылерыі знішчана 6 самалётаў праціўніка.

На тэрыторыі Чэхаславакіі на паўночным захадзе ад горада Гадонін, войскі фронта з баямі прасоўваліся ўперад. Занят населены пункт Кржэпіцэ, размешчаны ў 20 кілометрах на поўдні ад горада Брно. На адным участку група гвардзейпаў-кулямётчыкаў, на чале з старшым лейтэнантам Лабазіным, скрыта зайшла немцам у тыл і зрабіла засаду ля дарогі. Неўзабаве паказалася варожая калона. Падпусціўшы праціўніка на блізкую адлегласць, совецкія кулямётчыкі раптоўна адкрылі агонь. Немцы ў паніцы пачалі разбягацца, кідаючы ўзбраенне. У гэты час падаспелі байцы падраздзялення старшага лейтэнанта Сарокіна. Яны з ходу атакавалі бягучых гітлераўцаў, знішчаючы іх штыкамі, прыкладамі і гранатамі. 180 нямецкіх салдат і афіцэраў спынілі супраціўленне і склалі зброю. Гвардзейцы захапілі 200 павозак, 600 коней, 2 бронетранспарцёры, 38 кулямётаў і другія трафеі.

У Аўстрыі, на поўначы і захадзе ад горада Санкт-Пельтэн нашы войскі з баямі прасоўваліся ўперад. Зламаўшы супраціўленне немцаў, совецкія часці занялі населены пункт Обер-Вельблінг і ўступілі ў горна-лясісты раён. Праціўнік прадпрыняў некалькі контратак, але з вялікімі стратамі быў адкінут. Другія нашы часці выбілі гітлераўцаў з раду населеных пунктаў і выйшлі да ракі Пілах. За дзень баёў нашымі войскамі захоплена ў немцаў 32 танкі і самаходныя гарматы, 62 палявыя гарматы, 32 бронетранспарцёры, 188 кулямётаў, 210 чыгуначных вагонаў з грузамі і 42 склады з боепрыпасамі і рознай ваеннай маёмасцю.

Ад'езд з Масквы Старшыні Совета Міністраў Югаславіі Маршала І. БРОЗ-ТІТО

16 красавіка з Масквы выехаў Старшыня Совета Міністраў Югаславіі Маршал Іосіф Броз-Тіто ў суправаджэнні Міністра па Справах Чорнагорыі генерал-лейтэнанта М. Джыласа, Міністра Гандлю і Снабжэння пана Н. Петровіча і Міністра Горнай Прамысловасці Б. Андрэева.

На вакзале Маршала І. Броз-Тіто і суправаджаючых яго асоб праводзілі Намеснік Старшыні Совета Народных Камісараў СССР і Народны Камісар Замежных Спраў СССР В. М. Молатаў, Намеснік Народнага Камісара Замежных Спраў СССР А. Я. Вышынскі, Начальнік Генеральнага Штаба Чырвонай Арміі генерал арміі А. І. Антонаў, генерал-палкоўнік Ф. І. Голікаў, Намеснік Старшыні Маскоўскага гарадскога совета М. А. Ясноў, Загадчык IV Еўрапейскага Аддзела НКЗС СССР А. А. Лаўрышчэў, камендант г. Масквы генерал-лейтэнант К. Р. Сінілаў, генерал-лейтэнант А. С. Гундораў, Намеснік Загадчыка Пратакольнага Аддзела НКЗС СССР Г. І. Фамін і др.

На вакзале прысутнічалі: састаў югаслаўскага пасольства на чале з паверанымі ў справах Югаславіі панам Р. Нікалаевічам, пасол Злучаных Штатаў Амерыкі пан А. Гарыман, пасол Польскай рэспублікі пан З. Матзелеўскі, пасол Вялікабрытаніі пан А. Кер, пасол Нарвегіі пан Р. Андворд, пасол Кітайскай рэспублікі пан Фу Бін-чан, пасол Грэцыі пан А. Палітыс, пасол Бельгіі пан З. Ле Га, пасол Мексікі пан Н. Басольс, пасол Італіі пан П. Кваронi, пасланнік Мангольскай народнай рэспублікі пан Самбу, пасланнік Эфіопіі пан Л. Таэзас, пасланнік Егіпта пан Д. Абдэль Рахім Бей, пасланнік Швецыі пан С. Седэрблюм, пасланнік Люксембурга пан Р. Блюм, прадстаўнік Балгарыі пан Д. Міхалчаў, паверaны ў справах Чэхаславацкай рэспублікі пан Я. Гніздо, паверaны ў справах Канады пан Л. Мейранд, паверaны ў справах Турэцкай рэспублікі пан А. Курал, паверaны ў справах Аўстраліі пан Э. Ашбі, паверaны ў справах Коста-Рыкі пан Э. Эспіноса, советнік пасольства Французскай рэспублікі пан П. Шарпанцье, а таксама пасол Злучаных Штатаў Амерыкі ў Кітаі пан П. Хэрлі, які знаходзіцца праездам у Маскве.

Разам з Маршалам І. Броз-Тіто выехалі совецкі пасол у Югаславіі І. В. Садчыкаў і начальнік совецкай ваеннай місіі ў Югаславіі генерал-маёр А. Ф. Кісялёў.

Маршала І. Броз-Тіто суправаджаюць Загадчык Пратакольнага Аддзела НКЗС СССР Ф. Ф. Малочкаў, Начальнік Аддзела Знешніх Зносін НКА генерал-маёр М. П. Кутузаў і начальнік ваеннай місіі Югаславіі генерал-лейтэнант Р. Прыморац.

Пры провадах быў выстраен ганаровы караул і былі выкананы дзяржаўныя гімны Югаславіі і Совецкага Саюза. Вакзал быў упрыгожан югаслаўскімі і совецкімі флагамі.

ПЕРАДМАЙСКАЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА

Пяць норм у змену

На заводзе, дзе дырэктарам тав. Арутунян, шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу Першага мая.

Асабліва самааддана працуе моладзь, якая сістэматычна перавыконвае свае зменныя заданні. Соцыялістычным спаборніцтвам на прадпрыемстве ахоплены ўсе комсамольска-маладзёжныя брыгады. Кожны рабочы адчувае адказнасць не толькі за сябе, за сваю брыгаду, але і за работу ўсяго завода.

Калі ў цэхах даведаліся аб тым, што брыгадзір комсамольска-маладзёжнай брыгады тав. Пракурат узнагароджан Граматай ЦК ЛКСМБ, то многія комсамольцы і моладзь іншых цэхаў, залаволеныя выдатнымі поспехамі свайго таварыша, рашылі не адставаць ад яго ў рабоце.

На агульным мітынгу моладзі, які адбыўся у цэху 16 красавіка, брыгадзір комсамольска-маладзёжнай брыгады тав. Коршун сказаў так:

— Калі Пракурат даў 426 процантаў, то я сёння і ў далейшым буду даваць не менш 500 процантаў нормы.

Пры падвядзенні вынікаў работы за дзень высветлілася, што абедзве маладзёжныя брыгады выканалі заданне за 16 красавіка на 500 процантаў. Такім чынам яны пакуль што падзяляюць паміж сабой пяршынства.

Комсамольска-маладзёжнай брыгадзе тав. Пракурат прысвоена званне франтавой. Дырэктар завода прэміраваў брыгадзіра грашыма.

Комсамольцы і моладзь нашага завода ўступілі ў соцыялістычнае спаборніцтва з комсамольцамі і моладдзю аўтазборачнага завода. З гэтага спаборніцтва мы разлічваем выйсці пераможцамі. Парука гэтаму—надзвычайны працоўны ўздым усяго калектыва.

В. ПУШКІН.

Поспехі комсамольска-маладзёжных брыгад

РЭЧЫЦА. (Кар. «Звязды»). На Рэчыцкай суднабудаўнічай верфі арганізаван новы цэх, дзе апрацоўваюцца розныя будаўнічыя матэрыялы. Тут праводзіцца пёска дошак, струганне, фугоўка і вырабляюцца розныя дэталі для баржабудаўніцтва. Асабліва добра працуюць комсамольска-маладзёжныя брыгады. Перадавой з'яўляецца брыгада, якой кіруе Любоў Чудноўская. У гэтым цэху шырока разгарнулася перадмайскае індывідуальнае і міжбрыгаднае соцыялістычнае спаборніцтва. Брыгада Чудноўскай выконвае нормы выпрацоўкі на 120 — 130 процантаў. Лепшыя рабочыя яе брыгады Марыя Кушнер, Марыя Лазарэвіч, Аляксандра Бахарова і другія свой план выконваюць на 130 процантаў.

Нядрэнных паказальнікаў работы дабілася і брыгада тав. Серака, якая сістэматычна дае 110 — 126 процантаў нормы.

Унутры брыгад добра пастаўлена агітацыйная работа. Амаль усе рабочыя гэтага цэха вывучаюць кнігу таварыша Сталіна «Аб вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза».

В. ГРЫБ.

Расце прадукцыйнасць працы

ПІНСК. (Кар. «Звязды»). На прадпрыемствах Пінска шырока разгарнулася перадмайскае соцыялістычнае спаборніцтва.

Рабочыя суднарамонтнага завода абавязаліся ў чэсць Першага мая выканаць праграму красавіка на 105 процантаў, закончыць аднаўленне трох нафтаналіўных барж і да Першага мая здаць у эксплаатацыю свой лесапільны завод, які будзе садзейнічаць паскарэнню рамонту і новаму будаўніцтву суднаў.

Першая дэкада красавіка дала значнае павышэнне прадукцыйнасці працы. Брыгада слесараў Разумеева штодзённа выконвае свае нормы на 159 процантаў. Брыгада Жабінскага штодзённа дае не менш 140 процантаў плана. Значна перавыконваюць свае дзённыя нормы брыгады токараў і кавалёў.

Рабочыя пінскага горпрамкамбіната спаборнічаюць за выкананне красавіцкага плана да 28 красавіка. Майстры краўцы тт. Нахімоўскі і Ількавец выпрацоўваюць па тры нормы ў дзень. На 400 процантаў выконвае сваё заданне майстар шавецкага цэха тав. Рохлін. Работніцы швейнага цэха тт. З. Германовіч і І. Ботчыц даюць па 180 процантаў выканання плана.

Калектыў 7-й дыстанцыі пуці, які заняў другое месца ў спаборніцтве на Брэст-Літоўскай чыгунцы, зараз змагаецца за заваяванне першага месца.

У выніку перадмайскага соцспаборніцтва гэты калектыў значна паскорыў тэмпы замены шпал і рамонту скрапленняў рэек. Заданне па замене 5.000 шпал будзе выканана ў красавіку — на два месяцы раней тэрміну.

Горсоветам і гаркомам КП(б)Б аб'яўлен месячнік па прывядзенню горада ў належнае санітарнае становішча. Для выканання гэтых работ у горадзе былі праведзены два масавыя нядзельнікі.

Першая прадукцыя аднаўленага цэха

На мінскай швейнай фабрыцы імені Крупскай 10 красавіка аднавіў сваю работу першы цэх. У ім працуюць 52 машыны. Ужо выпушчана партыя швейных вырабаў.

У другім цэху ўжо ўстаноўлена 36 машын. З 20 красавіка і тут пачнецца работа.

На фабрыцы адрамантавана і абсталявана памяшканне цэха індывідуальнага пашыву. У цэху пачалі працаваць першыя 15 майстраў.

Новыя віды прадукцыі фабрыкі „Комунарка"

На мінскай фабрыцы «Комунарка» шырока разгарнулася перадмайскае соцыялістычнае спаборніцтва за выкананне колькасных і якасных паказальнікаў работы. Вызначаецца сваёй работай змена майстра Зароўскага. Яна давяла выпрацоўку прадукцыі да 165 — 170 процантаў. Маладзёжна-комсамольская брыгада Палубачка выконвае па дзве нормы ў дзень.

У гэтым месяцы фабрыка выпускае новыя высокаякасныя пукеркі: «Перамога», «Буравеснік», «Вясна», шакаладны пукар і інш. — усяго 8 новых найменаванняў.

У НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯЦЕ ДЗЯРЖАЎНАГА КАНТРОЛЮ БССР

Народны камісарыят дзяржаўнага кантролю Беларускай ССР за апошні час праверыў рад прадпрыемстваў і арганізацый па пытаннях іх вытворча-гаспадарчай дзейнасці і правільнасці выдаткавання дзяржаўных грашовых сродкаў.

Пры праверцы вытворча-гаспадарчай дзейнасці мінскага хлебазавода «Аўтамат» устаноўлена, што былы галоўны бухгалтар хлебазавода Баравік Н. А. заблытаў пярвічны ўлік паступлення хлеба з завода ў экспедыцыю і ўлік пераапрацоўкі браку, у выніку чаго не пацвярджаецца дакументамі выдаткаванне пераапрацаванага бракаванага хлеба ў размеры 20.331 кілограма. Апрача таго, Баравік Н. А. нарушыў дзяржаўныя оптава-адпускныя цэны на хлеб.

Былы загадчык экспедыцыі хлебазавода Палтаржыцкі А. М. незаконна адпусціў розным асобам 195 кілограмаў хлеба.

Баравік Н. А. і Палтаржыцкі А. М. Наркаматам дзяржкантролю БССР прыцягнуты да судовай адказнасці.

Пры праверцы вытворча-фінансавай дзейнасці мінскай базы Маслапрома ўстаноўлена, што загадчык лабараторыі гэтай базы Кобрык А. Ю. наўмысла няправільна вызначала процант вады ў масле, у выніку чаго за два месяцы дзяржаве недадана 120 кілограмаў тапёнага масла. Кобрык А. Ю. Наркаматам дзяржкантролю БССР знята з займаемай пасады і прыцягнута да судовай адказнасці.

Пры праверцы правільнасці выдаткавання сродкаў мінскім горфінаддзелам устаноўлена, што былым загадчыкам мінскага гарфо Картушыным І. М. нарушана фінансавая дысцыпліна—дапушчана перавыдаткаванне сродкаў на гаспадарчыя патрэбы, якое аднесена на артыкул выдаткавання па зарплаце. Апрача таго, Картушын, скарыстоўваючы сваё службовае становішча, атрымліваў грошы па авансавай справаздачы больш чым патрабавалася, а таксама атрымліваў зарплату за незаконнае сумяшчэнне.

Галоўны бухгалтар гарфо Царанкоў В. І. дапусціў аплату маёмасці, набытай па самавольна вызначаных цэнах у прыватных асоб, не ўтрымаў з Картушына І. М. дзяржаўных падаткаў у суме 632 руб. 98 кап. і з самаго сябе—ваеннага падатку—110 руб.

Наркамат дзяржкантролю БССР аб'явіў суровую вымову Картушыну І. М. і за нанесеныя страты дзяржаве зрабіў на яго налік у суме 4.200 рублёў. Царанкову В. І. таксама аб'яўлена вымова і зроблен налік у суме 742 руб. 98 кап.

(БЕЛТА).

СЕЯЦЬ ХУТКА І ВЫСОКАЯКАСНА!

* * *

НА ПАЛЯХ ПІНШЧЫНЫ

ПІНСК. (Кар. «Звязды»). На палях Пінщчыны шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва за паспяховае правядзенне веснавой сяўбы, за атрыманне ў гэтым годзе высокага ўраджаю. У спаборніцтва ўключыліся раёны, сельсоветы, вёскі, калгасы і МТС.

На тэрыторыі Столінскага раёна ў многіх сялян не аказалася насення яравых культур. Набыць насенне не ўсе маглі. Каб не сарваць сяўбу, гэтым гаспадаркам тэрмінова трэба было аказаць дапамогу. У вёсках раёна прайшлі сходы, на якіх было абмеркавана гэтае пытанне.

— Дапаможам, не пакінем сваіх адпавяскоўцаў без насення, — сказалі сяляне.

Пачаўся збор насення ў фонд дапамогі. За некалькі дзён было сабрана 3.125 пудоў. Адначасова ва ўсіх вёсках раёна былі створаны звенні для дапамогі бясконным гаспадаркам і сем'ям франтавікоў.

Спаборнічаючы паміж сабой, сяляне аказваюць канкрэтную дапамогу адзін аднаму. Так, сяляне Дубойскага сельсовета, не маючы магчымасці працаваць у сябе на полі, бо зямля тут была гразкая, штодзённа пасылалі 20 коней для дапамогі сялянам Рэчыцкага сельсовета, дзе глеба падсохла. За некалькі дзён у Рэчыцкім сельсавеце былі засеяны 62 гектары яравых культур. Таксама зрабілі і сяляне вёскі Бератное, якія дапамаглі сялянам вёскі Грушэвічы.

У Драгічынскім раёне гэтымі днямі быў праведзен масавы нядзельнік дапамогі сем'ям франтавікоў. Удзельнікі нядзельніка апрацавалі і абсеялі палі многіх сем'яў франтавікоў і партызан.

На дапамогу бясконным гаспадаркам і сем'ям франтавікоў прышлі МТС. Пры Столінскай машынна-трактарнай станцыі створан конна-пракатны пункт. 12 коней гэтага пункта працуюць на палях бясконных гаспадарак. Іванаўская МТС паслала трактар для апрацоўкі палёў бясконных гаспадарак і сем'яў франтавікоў. За першыя тры дні работы трактар узараў 12 гектараў глебы, якая належыць шасці сялянскім гаспадаркам.

З разгортваннем палявых работ у многіх раёнах наглядаецца імкненне сялян аб'еднацца ў калгасы. Гэтае пытанне горача абмяркоўваецца ў вёсках Драгічынскага раёна. Сяляне вёскі Брашэвічы першымі ажыццявілі сваё жаданне. У чэсць перамогі Чырвонай Арміі яны назвалі свой калгас іменем «Перамога». У гэты калгас аб'ядналася 18 гаспадарак. У Гашэўскім сельсавеце арганізаван калгас «Чырвоная Дуброўка», у які аб'ядналася 11 гаспадарак. Абагуліўшы сродкі вытворчасці і выбраўшы праўленні, маладыя калгаснікі адразу ўзяліся за калектыўную апрацоўку палёў і сяўбу.

На дапамогу маладым калгаснікам Драгічынская МТС паслала трактар і коней з конна-пракатнага пункта.

Шырокаму разгортванню соцыялістычнага спаборніцтва на палях у многім садзейнічалі праведзеныя ў абласці і раёнах сялянскія сходы. На гэтых сходах былі заключаны дагаворы на соцыялістычнае спаборніцтва паміж раёнамі. Яны з'явіліся штуршком да праяўлення ініцыятывы сялян у зборы насення, арганізацыі дапамогі бясконным гаспадаркам, павысілі працоўны энтузіязм сялянства.

Абкомам партыі ва ўсе раёны накіраваны спецыяльныя агітгрупы, якія праводзяць сходы сялян, прысвечаныя абмеркаванню пастановы Соўнаркома БССР і ЦК КП(б) Беларусі аб плане развіцця сельскай гаспадаркі Беларускай ССР на 1945 год. Агітгрупы праводзяць лекцыі і даклады на вёсны, кансультуюць мясцовых агітатараў. Перад пачаткам палявых работ ва ўсіх раёнах былі праведзены нарады агітатараў.

Усё гэта прывяло да значнага паляпшэння масава-палітычнай работы сярод сялян. Гэта падняло на новую ступень соцыялістычнае спаборніцтва, актывізавала сялянства на правядзенне веснавой сяўбы. Па абласці на 10 красавіка было засеяна каля 14,5 тысяч гектараў яравых культур і падрыхтавана глебы пад сяўбу каля 11.000 гектараў.

Першыя поспехі соцыялістычнага спаборніцтва трэба ўсямерна множыць. Вельмі важна цяпер наладзіць работу трактарнага парка і конна-пракатных пунктаў. У некаторых МТС да гэтага часу трактары выедуць у поле, папрацуюць гадзіну-другую і стаяць у баразне. Так працуюць трактары Лунінецкай і Жабчыцкай МТС. Дарэчы сказаць, у Лунінецкай МТС у першы-ж дзень работы былі выплаўлены падшыпнікі ў двух трактарах, а ў Жабчыцкай МТС — у адным трактары. Конна-пракатныя пункты лічацца створанымі пры ўсіх МТС, а на справе конна-пракатны пункт пры Целеханскай МТС не мае яшчэ коней. Не ўкамплектаваны гэтыя-ж пункты цяглом у Пінскім, Лунінецкім і Лагішынскім раёнах.

Месцамі сялянам яшчэ не даведзены планы сяўбы, не адведзены зямельныя ўчасткі. Гэта адносіцца да Гортальскага сельсовета, Целеханскага раёна, Бяздзежскага сельсовета, Драгічынскага раёна.

Нік. ЭРДМАН.

* * *

СПАБОРНІЦТВА ДВУХ РАЁНАЎ

ЗАСЛАЎЕ. (Кар. «Звязды»). На заклік кубанскіх хлебаробаў калгаснікі і работнікі МТС Заслаўскага раёна адказваюць масавым разгортваннем палявых работ.

Днямі ў Заслаўі адбылася раённая нарада перадавікоў сельскай гаспадаркі. У нарадзе прынялі ўдзел старшыні сельсветаў і калгасаў, брыгадзіры, звеннявыя, аграномы і работнікі МТС, партыйны і совецкі актыў раёна.

Удзельнікі нарады падзяліліся вопытам сваёй работы па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і першымі вынікамі масавых палявых работ.

Трактарыст Новадворскай МТС тав. Вайтовіч у сваім выступленні заявіў:

— Нашы трактары добра падрыхтаваны да палявых работ. Мы, трактарысты, будзем працаваць па-ваеннаму, будзем працаваць ад цямна да цямна, а калі спатрэбіцца, і ўначы і з гонарам выканаем узятыя на сябе абавязацельствы.

— У нашым калгасе гаворыць брыгадзір калгаса імені VII з'езда Совецкаў тав. Паркалёва,—яшчэ зімой пачалі рыхтавацца да веснавой сяўбы. Загадзя былі адрамантаваны плугі, бораны, калёсы. Калгас своечасова выйшаў на палявыя работы і засеяў першыя гектары яравых культур. Мы не пашкадуем ні сілы, ні працы для паспяховага завяршэння сяўбы і атрымання ў гэтым годзе высокага ўраджаю.

Раённая нарада абмеркавала і прыняла канкрэтныя абавязацельствы калгаснікаў і работнікаў МТС па ўздыму ўраджайнасці і паспяховаму правядзенню ўсіх сельскагаспадарчых работ у 1945 годзе. Нарада выклікала на соцыялістычнае спаборніцтва калгаснікаў Мінскага сельскага раёна. Прысутныя на нарадзе прадстаўнікі ад калгасаў Мінскага раёна выклік прынялі.

У прынятым соцыялістычным дагаворы калгаснікі Заслаўшчыны абавязаліся своечасова і высокаякасна завяршыць сяўбу яравых, зернавыя пасеяць за 7—8 дзён, бульбу пасадзіць за 10 дзён. Перадавікі сельскай гаспадаркі ад імені ўсіх калгаснікаў раёна абавязаліся перавыканаць план веснавой сяўбы не менш як на 5 процантаў і дабіцца, каб кожны трактар у сярэднім выпрацаваў не менш 800 гектараў.

Нарада пастанавіла прасіць газету «Звязда» быць арбітрам у соцыялістычным спаборніцтве двух раёнаў.

А. ЮЛІН.

У ЧЭСЦЬ СВЯТА

ХАЛОПЕНІЧЫ. (Кар. «Звязды»). Надвор'е рэзка мяняецца: то пярушыць дробны веснавы дожджык, то ідзе снег, то ласкавае красавіцкае сонца сагравае зямлю. Але калгаснікі не асабліва звяртаюць увагу на капрызы прыроды. Яны паспяхова прадаўжаюць ворыва і на падсохшых участках пачынаюць сеяць раннія яравыя культуры.

У адказ на заклік кубанскіх хлебаробаў калгаснікі Халопеншчыны абавязаліся атрымаць з кожнага гектара не менш 70 пудоў жыта, 75 пудоў ячменю, 75 пудоў аўса і 1.200 пудоў бульбы.

Палявыя работы разгортваюцца. Натхнёныя гістарычнымі перамогамі Чырвонай Арміі на франтах Айчыннай вайны, калгаснікі працуюць з патроенай энергіяй. Уключыўшыся ў перадмайскае соцыялістычнае спаборніцтва, аратыя сельгасарцелі імені Максіма Горкага Іван Бакач, Васіль Шульга і Еўдакім Шульга пачалі значна перавыконваць узёныя нормы.

У калгасе «Перамога», дзе пасеялі першыя гектары ячменю, узорна працуюць калгаснікі Вішнякоў і Валаховіч. Па Краснаслуцкаму сельсавету ўзарана звыш 300 гектараў глебы, забаранавана больш 200 гектараў і засеяна раннімі яравымі каля 100 гектараў.

Добра арганізаваны палявыя работы і ў Латыгаліцкім сельсавеце, дзе старшынёй Пётр Даражынскі.

У Траянаўскім сельсавеце першае месца па разгортванню масавых палявых работ і сяўбе займае калгас «Профінтэрн». Узорна працуюць у гэтай арцелі аратыя Сідар Салаўёў, Павел Асташка, Філіп Гаспадарык і Ліда Логіс. Спачатку яны выконвалі нормы на 150 процантаў, а зараз дабіліся штодзённага выканання нормы на 200 і больш процантаў. Якасць іх ворыва добрая.

Калгаснікі Халопеншчыны паставілі задачу — дзень Першага мая сустрэць новымі вытворчымі перамогамі. Калгаснікі раёна змагаюцца за скапчэнне сяўбы яравых культур да 1 мая.

Г. БАЯРЫН.

ВЫСТУПЛЕННЕ ПРЭЗІДЭНТА ТРУМЭНА Ў КАНГРЭСЕ ЗША

ВАШЫНГТОН, 16 красавіка. (ТАСС). Прэзідэнт ЗША Трумэн, выступаючы на аб'еднаным паседжанні абодвух палат кангрэса, заявіў:

«Я з цяжкім сэрцам стаю перад вамі, мае сябры і калегі ў кангрэсе ЗША. Толькі ўчора мы пахавалі астанкі нашага любімага Прэзідэнта Рузвельта. У такі час слоў недастаткова. Самай красамоўнай данінай было-б благагавейнае маўчанне.

Аднак у гэты рашаючы час, калі сусветныя падзеі так быстра развіваюцца, наша маўчанне можа быць няправільна вытлумачана і можа супакоіць нашых ворагаў.

Усемагутнаму Богу ў яго бясконцай мудрасці было ўгодна ўзяць у нас вялікага чалавека, які любіў усё чалавецтва і быў ім любімы. Ні адзін чалавек не мог-бы запоўніць велізарную пустату, якая ўтварылася з уходам гэтай благароднай душы. Ніякія словы не могуць уцешыць балячых сардэц шматлікіх мільёнаў людзей усіх рас, веравызнанняў і адценняў скуры. Свет ведае, што ён страціў гераічнага паборніка справядлівасці і свабоды.

Трагічны лёс усклаў на нас сур'ёзную адказнасць. Мы павінны прадаўжаць ісці ўперад. Наш памёршы лідэр ніколі не аглядваўся назад. Ён глядзеў уперад і ішоў уперад. Гэтага ён хацеў-бы і ад нас. Амерыка так і паступіць.

Ужо праліта столькі крыві за ідэалы, якія мы пестуем і дзеля якіх Рузвельт жыў і памёр, што мы не можам ні на хвіліну дазволіць сабе спыніць цяжкую барацьбу за дасягненне перамогі.

Цяпер увесь свет чакае ад Амерыкі асвечанага кіраўніцтва ў інтарэсах міру і прагрэса. Такое кіраўніцтва патрабуе дальнабачнасці, смеласці і цярпімасці. Яно можа быць забяспечана толькі аб'еднанай нацыяй, глыбока адданай самым высокім ідэалам.

Я заклікаю ўсіх амерыканцаў дапамагчы мне захаваць адзінства нацыі ў абароне тых ідэалаў, якія былі так красамоўна абвешчаны Рузвельтам. Я, у сваю чаргу, хачу запэўніць маіх братоў-амерыканцаў і ўсіх тых, хто любіць мір і свабоду ва ўсім свеце, што я буду падтрымліваць і абараняць гэтыя ідэалы ўсімі сіламі і ўсім сэрцам. Гэта мой абавязак, я не ўхілюся ад яго.

Каб не было магчымых няяснасцей, Германія і Японія могуць быць упэўненымі, не маючы ні малейшых сумненняў, у тым, што Амерыка будзе прадаўжаць барацьбу да таго часу, пакуль не будуць падаўлены апошнія рэшткі супраціўлення. Мы глыбока ўсведамляем той факт, што нам прадстаіць яшчэ вялікая, цяжкая барацьба. Заплаціўшы такую дарагую цану за тое, каб забяспечыць поўную перамогу, Амерыка ніколі не падпішыцца ні пад якім планам частковай перамогі. Згадзіцца на тое, што было-б толькі новай часовай перадышкай, — гэта бясспрэчна значыць стварыць пагрозу для будучай бяспекі ва ўсім свеце. Нашым патрабаваннем была і астаецца безагаворачная капітуляцыя. Мы не будзем дагаворвацца з парушыцелямі міру аб умовах міру.

Адказнасць за заключэнне міру — і гэта вельмі сур'ёзная адказнасць — павінна аставацца на абаронцах міру — Аб'еднаных Нацыях. Мы ўсведамляем патрабаванні гуманнасці. Мы не хочам бачыць непатрэбныя або неапраўданыя пакуты. Але законы Бога і чалавека былі парушаны, і віноўныя не павінны пазбегнуць пакарання. Нішто не пахісне нашай рашымасці пакараць ваенных злачынцаў—нават калі для гэтага нам прыдзецца праследваць іх да краю свету. Трывалы мір ніколі не зможа быць устаноўлен, калі мы дазволім нашым небяспечным праціўнікам, дзе-б яны ні схаваліся, як-бы далёка ні быў гэты куток, беспакарана распрацоўваць планы будучых войн. У гэтым свеце, у якім адлегласці ўвесь час скарачаюцца, бескарысна шукаць бяспекі за геаграфічнымі бар'ерамі. Сапраўдная бяспека будзе знойдзена толькі ў законе і справядлівасці.

Тут, у Амерыцы, мы доўга і цяжка працавалі для таго, каб дасягнуць соцыяльнага парадку, дастойнага нашага вялікага наследдзя. У нашы дні быў зроблен велізарны поспех у справе ўстанаўлення сапраўды дэмакратычнага вобразу жыцця. Дазвольце мне запэўніць перадавых людзей Амерыкі ў тым, што мы не аслабім нашых намаганняў у справе палепшання лёсу простага чалавека. У прадстаячыя цяжкія дні перад намі, безумоўна, паўстануць велізарныя праблемы. Аднак з верай нашых бацькоў у нашых сэрцах мы не баімся будучага.

На франтах нам часта процістаялі перавыходзячыя сілы ворагаў, і мы іх перамагалі. У сябе ў краіне амерыканцы будуць дзейнічаць не менш рашуча. Мы ніколі не спынім нашу барацьбу ў абарону і захаванне нашага амерыканскага вобразу жыцця. У даны момант Амерыка разам з яе храбрымі саюзнікамі зноў плаціць велізарную цану, абараняючы нашу свабоду. З характэрнай для нас энергіяй мы дапамагаем вызваленню цэлых краін. Паступова аковы рабства разбіваюцца сіламі свабоды. Мы ўсе змагаемся за дасягненне хуткай перамогі. Кожны дзень адцяжкі міру абыходзіцца вельмі дорага. Сёння арміі вызвалення нясуць канец страшнай пагрозе Гітлера ўстанавіць панаванне над светам. Цвярдыні Токіо знаходзяцца пад ударам нашых бомб. Галоўная стратэгія вайны Аб'еднаных Нацый вызначана ў нямалай ступені дзякуючы праніклівасці пакінуўшага нас галоўнакамандуючага. Цяпер мы выконваем нашу ролю ў гэтай стратэгіі пад здольным кіраўніцтвам адмірала Легі, генерала Маршала, адмірала Кінга, генерала Арнольда, генерала Эйзенхаўэра, адмірала Німіца і генерала Макартура.

Я хачу, каб увесь свет ведаў, што гэта кіраўніцтва павінна астацца і астанецца нязменным і нішто не будзе яму перашкаджаць. Наш доўг у адносінах да гераічных мужчын і храбрых жанчын, якія знаходзяцца ва ўзброеных сілах нашай краіны, ніколі не зможа быць аплачан. Яны заслугоўваюць нашай вечнай падзякі. Амерыка ніколі не забудзе іх афяр. Дзякуючы гэтым афярам зара справядлівасці і свабоды ва ўсім свеце павольна ўзыходзіць на гарызонце. Нашы продкі прышлі на нашы суровыя берагі ў пошуках рэлігійнай цярпімасці, палітычнай свабоды і эканамічных магчымасцей. Яны рызыкавалі сваімі жыццямі ў барацьбе за гэтыя асноўныя правы. Сёння мы добра ведаем, што гэтыя правы могуць быць захаваны толькі з дапамогай пастаяннай пільнасці — вечнай цаны свабоды.

Праз гадзіну пасля таго, як я прыняў прысягу, я аб'явіў, што канферэнцыя ў Сан-Францыска адбудзецца. Мы разгледзім праблемы міру з такой-жа смеласцю, з якой мы сустрэлі і адолелі праблемы вайны. Дзеля памяці тых, хто прынёс вышэйшую афяру, дзеля памяці нашага паўшага прэзідэнта, мы выканаем ускладзеную на нас задачу. Недастаткова толькі жадаць міру. Мы павінны працаваць і, калі патрэбна, змагацца за яго. Задача стварэння разумнай міжнароднай арганізацыі складаная і цяжкая. Але без такой арганізацыі не змогуць быць абаронены правы чалавека на зямлі. Павінен быць знойдзен механізм для справядлівага ўрэгулявання міжнародных рознагалосся. Без такога механізма ўвесь свет павінен будзе аставацца ўзброеным лагерам. Чалавецтва будзе асуджана на смяротны канфлікт і будзе пазбаўлена надзеі на сапраўдны мір. На шчасце, народы атрымалі надзею на трывалы мір. Мыслячыя людзі заўсёды верылі, што ў канчатковым выніку павінна перамагчы справядлівасць. Мінулы вопыт, безумоўна, паказвае, што без справядлівасці трывалы мір становіцца немагчымым.

У горкім адчаі некаторыя людзі прыходзяць да выводу, што войны неміну чы. З трагічным фаталізмам яны сцвярджаюць, што, паколькі войны заўсёды былі, неабходнасць у войнах заўсёды астанецца. Мужчыны і жанчыны добрай волі не павінны і не могуць уступіць такім паражэнчым настроям. Будучае для чалавецтва не з'яўляецца такім безнадзейным. У самыя змрочныя гадзіны гэтай жудаснай вайны цэлыя краіны падтрымліваліся чымсьці няўлоўным—надзеяй. Калі іх перасцерагалі, што нікчэмнае падначаленне з'яўляецца адзіным выратаваннем ад пераўзыходзячай сілы, надзея ўказвала шлях да перамогі. Надзея стала тайнай зброяй сіл вызвалення. Агрэсары не здолелі падначаліць сваёй уладзе чалавечы розум. Да таго часу, пакуль астаецца надзея, дух чалавека ніколі не будзе пераможан.

Але адна надзея не была і не з'яўляецца дастатковай для прадухілення вайны. Мы павінны не толькі спадзявацца, але мы павінны валодаць дастатковай верай, каб працаваць з другімі міралюбівымі нацыямі для падтрымання міру. Надзея аказалася недастатковай для таго, каб адкінуць агрэсараў, пакуль міралюбівыя нацыі не праяўлялі жадання прысці адна да другой на дапамогу. Агрэсары былі адкінуты толькі тады, калі міралюбівыя нацыі аб'ядналіся, каб абараніць сябе.

Калі мы хочам, каб у будучым былі прадухілены войны, нацыі павінны быць адзін ў сваёй рашымасці падтрымаць мір, згодны з законам. Нішто не можа быць больш важным для будучага ўсеагульнага міру, чым захаванне супрацоўніцтва нацый, якім прышлося сабраць неабходныя сілы для разстройства загавору фашысцкіх дзяржаў, праследваўшага мэту ўстанаўлення панавання над светам.

У той час, як вялікія дзяржавы нясуць на сабе асобую адказнасць у справе падтрымання міру, іх адказнасць грунтуецца на абавязацельствах усіх нацый — вялікіх і малых — не прымяняць сілы ў міжнародных адносінах, за выключэннем тых выпадкаў, калі гэта неабходна для абарону закона. Абавязак вялікіх дзяржаў заключаецца ў тым, каб служыць народам свету, а не панаваць над імі.

Каб стварыць аснову трывалага міру, мы не толькі павінны працаваць у гармоніі з нашымі прыяцелямі за граніцай, але мы павінны мець аб'еднанае падтрымманне нашага ўласнага народа. Нават самы вопытны рулявы не можа ўдала прывесці судна гавань, калі каманда не аказвае яму поўнага падтрымання. Для агульнай карысці кожны чалавек павінен выконваць свой абавязак.

Я заклікаю ўсіх амерыканцаў, незалежна ад іх партыйнай прыналежнасці, расы, веравызнання і колеру скуры, аказаць падтрымманне нашым намаганням, накіраваным на тое, каб стварыць моцную і ўстойлівую арганізацыю Аб'еднаных Нацый.

Вы, члены кангрэса, бясспрэчна, ведаеце, якія пачуцці я адчуваю. Толькі з вашай дапамогай я магу спадзявацца выканаць адну з найвялікшых задач, якая калі небудзь выпадала на долю слугі дзяржавы. З благаславення Ўсевышняга і з вашай дапамогаю мы знойдзем новы шлях да больш лепшага, добрага і прыязнага міру, у якім будзе панаваць справядлівы і працяглы мір. З давер'ем я спадзяюся на ўсіх вас.

Для знішчэння прагавітых тыранаў з іх планамі сусветнага панавання мы не можам з пакалення ў пакаленне прадаўжаць афяроўваць нашымі самымі лепшымі маладымі сіламі. У імя чалавечага дастоінства і цывілізацыі неабходна знайсці больш рацыянальны метад урэгулявання рознагалосся паміж нацыямі, і ён будзе знойдзен. Амерыка павінна дапамагчы пакутуючаму чалавецтву вярнуцца на шлях мірнага прагрэса. Гэта патрэбуе часу і цярпімасці. Нас спатрэбіцца пастаянная вера ў народ, такога роду вера і мужнасць, якімі заўсёды валодаў Рузвельт. Зараз Амерыка стала адной з самых магутных сіл у барацьбе за працвітанне чалавецтва. Мы павінны захаваць гэтае становішча Амерыкі. Мы дабіліся вядучай ролі ў свеце, якая залежыць не толькі ад нашай ваеннай і марской магутнасці. Мы навучыліся змагацца разам з другімі нацыямі ў агульнай барацьбе за абарону нашай свабоды. У даны момант мы павінны навучыцца жыць разам з другімі нацыямі ў інтарэсах нашай агульнай карысці. Мы павінны навучыцца больш гаварыць з другімі нацыямі з тым, каб мы на было для нашай узаемнай карысці павялічыць вытворчасць, занятасць рабочай сілы і павысіць узровень жыцця ва ўсім свеце.

Мы, амерыканцы, павінны быць дастойнымі нашага слаўнага наследдзя. Такім чынам Амерыка ўпаўне зможа весці чалавецтва да міру і працвітання.

У даны момант маё сэрца поўна малітвы. Прыступаючы да выканання маіх цяжкіх абавязкаў, я пакорна малю Ўсемагутнага Бога словамі Саламона: «Даруй слузе твайму разумеючае сэрца, каб судзіць твой народ, каб я мог адрозніць дабро ад зла, бо хто можа быць суддзёй твайго вялікага народа?». Я прашу толькі аб тым, каб быць добрым і верным слугой майго Госпада і майго народа».

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

ЛОНДАН, 17 красавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што на прапягу 15 красавіка здаліся ў палон арміям саюзнікаў яшчэ 66 тысяч германскіх салдат. У паведамленні штаба ўказваецца, што танкі саюзнікаў, наступаючы з прадмостных умацаванняў на рацэ Алер, прасунуліся прыблізна на 24 кілометры. Заходні бераг ракі Эльбы знаходзіцца зараз у руках саюзнікаў, за выключэннем невялікіх вузлоў супраціўлення праціўніка ад Вітэнбергі і злівіця рэк Эльба і Заале. На поўдні ад гэтага раёна танкавыя часці саюзнікаў прасунуліся на 37 кілометраў і дасягнулі раёна на поўначы ад Хемніца.

На заходнім узбярэжжы Францыі саюзнікі занялі Руаян.

НАЛЁТ АМЕРЫКАНСКАЙ АВІЯЦЫІ НА ПАЎДНЁВУЮ ГЕРМАНІЮ

ЛОНДАН, 17 красавіка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, звыш 750 амерыканскіх цяжкіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі ўчора ўдзень налёт на чыгуначныя аб'екты Паўднёвай Германіі. Бамбардыроўшчыкі ішлі ў суправаджэнні больш чым 850 знішчальнікаў.

ВАЙНА НА ЦІХІМ АКІЯНЕ

ВАШЫНГТОН, 17 красавіка. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, з 12 па 15 красавіка амерыканскія самалёты, якія базіруюцца на авіяносцы, знішчылі ў часе налётаў на астравы Кюсю і Руку 368 японскіх самалётаў і пашкодзілі 60. Амерыканскія войскі высадзіліся на востраве Іесіма, размешчаным на паўночным захадзе ад вострава Окінава, і занялі там аэрадром.

16 красавіка буйныя злучэнні амерыканскіх звышмагутных бамбардыроўшчыкаў «Лятаючая крэпасць», якія базіруюцца на Марыанскія астравы, зрабілі налёт на вострай Кюсю (Японія).

БЛІ У ЮГАСЛАВІІ

БЕЛГРАД, 17 красавіка. (ТАСС). Генеральны штаб югаслаўскай арміі паведамляе, што пасля жорсткіх баёў югаслаўскія войскі ліквідавалі рэшткі разбітых нямецкіх часцей у Срэме. Ваенныя дзеянні ў гэтай абласці спыніліся. Захоплены буйныя трафеі.

У даліне ракі Босна прадаўжаецца пасляховае наступленне.

У Харвацкім Прыморыі югаслаўскія часці ва ўзаемадзеянні з сіламі югаслаўскага ваенна-марскога флота вызвалілі вялікую групу астравоў.

ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

У Швейцарыю тайна прыбыў вядомы германскі тэрарыст і галоўная даверная асоба германскага архізагаворшчыка фон Папена маёр Владэмар Пабст.

* * *

Парыжскі суд прыгаварыў да кары смерцю начальніка спецыяльнай брыгады па рэпрэсіях у адносінах да французскіх патрыётаў у часе германскай акупацыі—Давіда, вінаватага ў катаваннях і забойстве 120 патрыётаў.

Адказны рэдактар В. САМУЦІН.

Энергетыкі не выконваюць сваіх абавязкаў

Аб марудных тэмпах аднаўлення электрастанцый

Хутчэйшае аднаўленне энергетычнай гаспадаркі—гэта адна з важнейшых задач, якія стаяць перад нашай рэспублікай. Адступаючы пад націскам Чырвонай Арміі, немцы ў першую чаргу імкнуліся паралізаваць галоўны жыццёвы нерв нашых гарадоў і прамысловасці—электрастанцыі. Большасць беларускіх электрастанцый была выведзена са строю, абсталяванне іх узарвана або вывезена ў Германію.

З першых дзён вызвалення Беларусі энергетыкі ўзяліся за аднаўленчую работу. У кароткі тэрмін яны здолелі забяспечыць гарады часткова вадой і асвятленнем, і некаторыя важнейшыя прадпрыемствы—электраэнергіяй.

Але задача энергетыкаў больш шырокая і складаная. Іх абавязак—з дня ў дзень павялічваць магутнасць сваіх прадпрыемстваў, хуткімі тэмпамі аднаўляць абсталяванне і ўводзіць яго ў строй. Адраджэнне энергетычнай базы Беларусі ва ўмовах разбуранай народнай гаспадаркі рэспублікі набывае рашаючае значэнне. Яна павінна забяспечыць электраэнергіяй існуючыя і ўступаючыя ў строй прадпрыемствы, новыя будоўлі, павінна стрымаць росту добрабыту працоўных. Работа прадстаіць вялікая і складаная, яна з поспехам можа быць выканана. Энергетыкам неабходна ўлічыць усю адказнасць ускладзенай на іх задачы і прыкласці максімум намаганняў да яе выканання.

Для аднаўлення энергетычнай гаспадаркі рэспублікі ўрадам адпускаюцца велізарныя сродкі. Але ўсё-ж адбудова электрастанцый і энергетычнага абсталявання праходзіць яшчэ вельмі марудныімі тэмпамі. Галоўэнергаўпраўленне Наркамата комунальнай гаспадаркі БССР у I квартале гэтага года не асвоіла 600 тысяч рублёў са сродкаў, адпушчаных на аднаўленне. Зусім дрэнна абстаіць тут справа з праектаваннем аб'ектаў. Кіраўнікі ўпраўлення і наркамата праяўляюць здзіўляючую бездапаможнасць у арганізацыі і забяспечанні гэтай справы. План забяспечання электраэнергіяй у I квартале па ўсіх прадпрыемствах далёка не выкананы. Спажыўцу не дададзена звыш мільёна кіловат-гадзін электраэнергіі.

Для электрастанцый устаноўлены планы іх аднаўлення і пуску ў ход. Але планы ў тэрмін не выконваюцца. У I квартале ў Гомелі павінна была ўвайсці ў строй магутная турбіна. Яна яшчэ не дзейнічае і да сённяшняга дня. Кіраўнікі электрастанцыі не праяўляюць дастатковай энергіі і настойлівасці, каб своечасова выканаць план устаноўленых работ, не скарыстоўваюць усіх магчымасцей.

Такое-ж становішча і ў некаторых іншых гарадах. Не ўвайшла ў строй у I квартале запраектаваная па плану турбіна ў Гродна. У Брэсце да гэтага часу нават часткова не адноўлена абсталяванне. Прыбыўшы туды энергапоезд не сабран. Вельмі марудна ідзе аднаўленне абсталявання ў Мазыры. Тут да гэтага часу не зроблен мантаж катлоў. Яшчэ больш вяла праходзяць будаўнічыя работы.

Полацкая электрастанцыя вельмі моцна разбурана нямецкімі захопнікамі. Неабходна сур'ёзна папрацаваць, каб зноў яе поўнасцю аднавіць. Але кіраўнікі партыйных і совецкіх арганізацый абласці не праяўляюць неабходнай настойлівасці ў гэтай справе. У I квартале тут не асвоілі 100 тысяч рублёў, адпушчаных на адбудову электрастанцыі. Нядаўна ў Полацк завезена гідратурбіна і генератар. Яны стаяць пакуль што перухома. Кіраўнікі Галоўэнергаўпраўлення не распачалі работ па ўстанаўленню гэтага абсталявання, не паклапаціліся аб тым, каб паслаць на месца неабходных спецыялістаў.

Нездавальняюча працуюць мінскія электрастанцыі. Аднаўленне турбіны і катла на ГЭС-1 было закончана са спазненнем. Не аднаўляюцца тут і вытворчыя памяшканні.

Дырэктар Мінскай ГЭС-1 т. Дуброўскі тлумачыць усё недахопы перабоямі ў забяспечанні палівам, дрэнным яго якасцю. Але трэба сказаць, што дырэкцыя і партыйная арганізацыя электрастанцыі ў гэтым пытанні застаюцца ў ролі пасіўных наглядальнікаў, простых фіксатараў фактаў. Тут не было праяўлена дастатковай ініцыятывы для арганізацыі праверкі якасці паліва непасрэдна на торфапрадпрыемствах, ў своечасовым яго атрыманні. Гэта сцвярджаецца такімі фактамі: ўжо доўгі час электрастанцыя не атрымлівае паліва з торфазавода Міхаповічы і другіх заводаў. Але на электрастанцыі аб гэтым не ведаюць і лічаць, што іменна з гэтых торфапрадпрыемстваў яны атрымліваюць паліва дрэннай якасці. Бываюць выпадкі, калі работнікі электрастанцыі несвоечасова разгружаюць вагоны з торфам, якія прыбываюць да іх склада, і становяцца прамымі віноўнікамі прастою вагонаў.

Перад мінскімі электрастанцыямі паставлена адказнейшая задача. У карацейшы тэрмін сталіца рэспублікі павінна быць поўнасцю забяспечана электраэнергіяй, асвятленнем. У сталіцы нашай Беларусі разгортваюцца велізарнейшыя работы па яе адбудове. Вядома, што ўсе гэтыя работы будуць у вялікай ступені залежаць ад аднаўлення і развіцця энергетычнай гаспадаркі.

У сваіх рашэннях VI Пленум ЦК КП(б) Беларусі адзначыў, што аднаўленне энергетычнай базы рэспублікі праходзіць пакуль-што вельмі марудныімі тэмпамі. Прамы абавязак работнікаў энергетыкі, кіраўнікоў партыйных і совецкіх арганізацый — нясцынна і хутка аднаўляць і расшыраць энергетычныя магутнасці, у самы бліжэйшы тэрмін забяспечыць электраэнергіяй усе дзеючыя прамысловыя прадпрыемствы, стварыць умовы для далейшага развіцця прамысловасці Беларусі, для аднаўлення ўсёй народнай гаспадаркі рэспублікі.

Г. ШЧАРБАТАЎ,
С. САДОЎСКАЯ.

ТЭАТР І КІНО

Кінотэатр «Першы» «КРЫМСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ». Пачатак сеансаў у 12, 14, 16, 18, 20, 22 гадз.

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ФІЛАРМОНІЯ. У памяшканні Акруговага Дома Чырвонай Арміі 18 і 19 КРАСАВІКА.

КАНЦЭРТ АРТЫСТАЎ ЛЕНІНГРАДСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ЭСТРАДЫ пры ўдзеле дыпламанта Усесаюзнага конкурса майстраў эстрады ІГАРА МЭЙ. (Фельетоны, песенькі). Пачатак у 20 гадзін. Білеты ў касе АДЧА з 14 гадзін.

Кінотэатр «Беларусь» «АПОВЕСЦЬ АБ АДНЫМ КАРАБЛІ». Пачатак сеансаў у 12, 13 г. 50 м., 15 г. 30 м., 17 г. 15 м., 19 г. 5 м і 21 гадз.

Кінотэатр «Радзіма» «МАЯ ЛЮБОЎ». Пачатак сеансаў у 20, 22 гадз.

Дзіцячы кінотэатр 1. «ТВАР ФЮРЭРА. 2. «СТАРЫ МЛЫН» 3. «КАЗКА ПРА ЦАРА САЛТАНА» 4. Кіножурнал «НА СТАДЫЕНЕ ДЫНАМА». Пачатак сеансаў у 10, 11 г. 30 м., 13 г. 15 м., 14 г. 45 м., 16 г. 30 м., 18 г. 15 м.

АТ28725 АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Пушкіна, 55, 3-ці паверх. Тэлефоны: Адказнага рэдактара—149, Адказнага сакратара—150